## СЯМ’Я СВЕЧКІНЫХ



### Свечкіна Марфа Калінаўна

**Дата нараджэння:** 1905

**Дата смерці:** 16.11.1943

**Месца подзвігу:** г. Віцебск, Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1942–1943

**Ушанаванне:** г. Віцебск – вуліца, мемарыяльная дошка

### Свечкін Іван Калінавіч

**Дата нараджэння:** 1907

**Дата смерці:** 16.11.1943

**Месца подзвігу:** г. Віцебск, Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1942–1943

**Ушанаванне:** г. Віцебск – вуліца, мемарыяльная дошка

### Свечкін Анатоль Калінавіч

**Дата нараджэння:** 1911

**Дата смерці:** 16.11.1943

**Месца подзвігу:** г. Віцебск, Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1942–1943

**Ушанаванне:** г. Віцебск – вуліца, мемарыяльная дошка

Падпольная група Свечкіных пачала дзейнічаць у акупіраваным гітлераўцамі Віцебску ў 1942 годзе ў раёне Стадыённага пасёлка. Стваральнік і кіраўнік – М. К. Свечкіна (Блахіна), жонка савецкага афіцэра. У склад групы ўваходзілі яе браты Іван і Анатоль, іх жонкі Вольга і Аляксандра, Н. Воранава, І. Пруднікаў і інш. Падпольшчыкі падтрымлівалі сувязь з групай А. Я. Белахвосцікава, партызанскай брыгадай імя А. Ф. Данукалава («Аляксея»). Члены арганізацыі дастаўлялі партызанам медыкаменты, разведданыя, прыносілі ў горад міны і ўзрыўчатку. 12 лістапада 1943 года М. К. Свечкіна і яе браты былі арыштаваны і пасля катаванняў расстраляны.

У 1968 годзе на доме, дзе жылі Свечкіны, устаноўлена мемарыяльная дошка, іх імя носіць віцебская вуліца, на якой яны жылі (былая 5-я Стадыённая).

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, М. У.** Мемарыяльная дошка падпольшчыкам Свечкіным / М. У. Дарафеенка // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1985. – С. 69.

2. **Мезенка, Г. М.** Свечкіных вуліца / Г. М. Мезенка // Віцебшчына ў назвах вуліц : манаграфія : у 2 ч. / Г. М. Мезенка. – Віцебск, 2008. – Ч. 2. – С. 162.

3. **Падпольная** група М. К. Свечкінай // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 496.

4. **Подлипский, А. М.** Подпольщики Свечкины / А. М. Подлипский, В. Рогач // Доски берегущие память : справочник / А. М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск, 2006. – С. 12.

5. **Свечкины** Марфа, Иван, Анатолий, Ольга и Александра // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 536.

**Падпольная** група М. К. Свечкінай // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 496.

**ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА М. К. СВЕЧКІНАЙ**

Дзейнічала ў Віцебску ў Стадыённым пасёлку з верасня 1942 г. да лістапада 1943 г. Аб'ядноўвала 6 чалавек. Кіраўнік М. К. Свечкіна (Блахіна). У групу ўваходзілі яе браты Анатоль і Іван, іх жонкі В. С. і А. К. Свечкіны, Н. І. Воранава. Дзейнічала ў цеснай сувязі з групамі А. Я. Белахвосцікава, А. І. Кірыленкі (дзейнічала там жа), М. Л. Мурашкі і Р. Ф. Махнова, Т. А. Ламаносенкі. Была звязана з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А. Ф. Данукалава). У доме Свечкіных у пасёлку Качэргі захоўваліся ўзрыўчатка, міны, начавалі і адпачывалі разведчыкі і сувязныя. Дыверсійны матэрыял і літаратуру ад партызан прыносіла 16-гадовая Яўгенія Калабанава. У брыгаду патрыёты рэгулярна дастаўлялі разведданыя, медыкаменты, прыводзілі да партызан ваеннапалонных. Свечкіных забяспечвалі медыкаментамі ўрачы Р. Ф. Махноў, І. А. Пруднікаў і яго жонка В. А. Сянькоўская, медсястра К. Аляксеева і санітарка Ф. Аляксеева. Свечкіны разам з Махновым склалі і перадалі партызанам схему размяшчэння абарончых збудаванняў, зенітных батарэй і дыслакацыі вайсковых часцей праціўніка ў Віцебску. М. К. Свечкіна, А. К. Свечкін і І. К. Свечкін былі арыштаваны і 16.11.1943 расстраляны.

У Віцебску імем Свечкіных названа вуліца, на якой яны жылі; на доме № 1 у 1968 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. Усе 6 членаў групы ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

**Подлипский, А. М.** Подпольщики Свечкины / А. М. Подлипский, В. Рогач // Доски, берегущие память : справочник / А. М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск, 2006. – С. 12.

## ПОДПОЛЬЩИКИ СВЕЧКИНЫ

Семья Свечкиных – Иван, Анатолий, Марфа, проживавшие на этой улице, – активные участники Витебского патриотического подполья. Расстреляны фашистами в конце 1943 года.

(ул. Свечкиных, 1)

В подпольную группу Свечкиных, действовавшую в Стадионном поселке с сентября 1942 г. по ноябрь 1943 г., входило шесть человек. Руководила ею жена советского офицера, сражавшегося на фронте, Марфа Свечкина (Блохина). В группу входили ее братья Анатолий и Иван, их жены Ольга и Александра, а также подруга Марфы Надежда Воронова. Группа Свечкиных действовала совместно с группами других подпольщиков (А. Белохвостикова, В. Кириленко, М. Мурашко, Р. Махнова, Т. Ломоносенко). Она была связана с партизанской бригадой «Алексея». Дом Свечкиных служил хранилищем взрывчатки, мин, был местом ночлега и отдыха разведчиков и связных. Диверсионный материал и литературу приносила от партизан шестнадцатилетняя Е. Колобанова. В свою очередь подпольщики передавали народным мстителям медикаменты и медицинские инструменты, приводили бежавших военнопленных, желавших бороться с врагом. Свечкины вместе с врачом Р. Махновым составили и передали партизанам схему расположения оборонительных сооружений, зенитных батарей и дислокации воинских частей фашистов в Витебске. Осенью 1943 г. Марфа, Анатолий и Иван Свечкины были арестованы и 16 ноября расстреляны.

Именем патриотов Свечкиных в Витебске названа улица, а на доме № 1, где они жили, в 1968 г. установлена мемориальная доска.

**Свечкины** Марфа, Иван, Анатолий, Ольга и Александра // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 536.

**СВЕЧКИНЫ МАРФА, ИВАН, АНАТОЛИЙ, ОЛЬГА И АЛЕКСАНДРА**

*Члены Витебского патриотического подполья в годы Великой Отечественной войны.*

В 1942 в оккупированном Витебске в районе Стадионного поселка Марфа Калиновна Свечкина (Блохина, 1905 – 16.11.1943) – жена советского офицера, сражавшегося на фронте, создала и возглавила подпольную группу, в которую вошли ее братья Иван (1907 – 16.11.1943) и Анатолий (1911 – 16.11.1943), их жены Ольга и Александра, а также Н. И. Воронова. Группа поддерживала связь с группой А. Е. Белохвостикова, партизанской бригадой им. А. Ф. Данукалова («Алексея»), поставляла партизанам медикаменты, разведданные, подпольщикам города – мины и взрывчатку. Дом Анатолия Свечкина был надежным укрытием, местом ночлега и отдыха связных и партизанских разведчиков. 12.11.1943 М. К. Свечкина, ее братья Иван и Анатолий арестованы и после пыток расстреляны. Посмертно награждены медалью «За отвагу».

Именем Свечкиных названа улица в Витебске; на здании дома, в котором они жили, установлена мемориальная доска.